4. Лірыка М. Чарота. Выдрукавана пад тэй–жа назваю ў „Маладняку“, № 9 за 1925 г.

5. Літаратурныя пытаньні. Выдрукавана пад назваю „З літаратурных нататак“ у „Узвышшы“, № 1 за 1927 г. два разьдзелы: „Аб літаратурных пытаньнях наогул“ і „Аб самавызначэньні і самаацэнках творчых сіл мастатцва“.

6. М. Багдановіч у літаратурных ацэнках. Выдрукавана пад тэй–жа назвай у „Узвышшы“, № 2 за 1927 г.

7. Творчасьць Я. Коласа. Выдрук[аваны] адзін разьдзел пад назваю „Поэма „Сымон Музыка“ Я. Коласа“ ў „Узвышшы“, № 3 за 1927 г. і вынятка ў выглядзе невялічкага артыкулу пад назваю „Коласаўская праўда жыцьця“ — „Ч[ырвоны] С[ейбіт]“, № 3.

8. Творчасьць З. Бядулі. Выдрукавана адна частка пад назваю „Пералом у станаўленьні натуральнай культуры ў творчасьці З. Бядулі“ — „Узвышша“, № 3 за 1928 г.

9. Творчасьць Ул. Дубоўкі. Выдрукаваны наступныя разьдзелы:

А. Аб разуменьні мастацкай творчасьці і аб некаторых пытаньнях у вывучэньні беларускай літаратуры. „Узвышша“, № 5 за 1927 г.

Б. Творчасьць Ул. Дубоўкі як форма нацыянальнай сьвядомасьці пролетарскага характару. „Узвышша“, № 6 за 1927 г.

В. Творчасьць Ул. Дубоўкі як асноведзь беларускай пролетарскай поэзіі. Выдр[укавана] пад назваю „Творчасьць Дубоўкі“ — „Узвышша“, № 1 за 1928 г.

Г. Аквітызм творчасьці Ул. Дубоўкі. — „Узвышша“, № 2 за 1928 г.

10. Шэраг дробных прац, выдрукаваных у часопісах у выглядзе рэцэнзій або невялічкіх артыкулаў.

А. Бабарэка *(подпіс)*.
*1928 г. 19 верасьня.*

## № 2

У Дэканат Пэдагогічнага факультэту
Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту
Адама Антонавіча
Бабарэкі (Менск, Гарбарная, 18, кв. 1)

Заява

Жадаючы працаваць у галіне гісторыі беларускай літаратуры, прашу аб назначэньні мяне ў якасьці асыстэнта па катэдры гісторыі беларускай літаратуры. Самастойна ў гэтай галіне працую з 1924 году з ухілам, у пераважнасьці, да сучаснай беларускай літаратуры. Пры гэтым дакладаю свой кароткі жыцьцёпіс і пералік выдрукаваных прац.

А. Бабарэка *[подпіс]*
*4 ліпеня 1928 г.*
*м. Менск.*